Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 24 (266) | 22 верасня 1956 года | Цана 20 кап.

НОВАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАБІНЕТАХ

У гэтым навучальным годзе кабінеты юрыдычнага факультэта папоўніліся новай літаратурай. Многа новых кніг паступіла у кабінет крымінальнага права і працэса. Сярод іх такія, як «Косвенные доказательства в советском уголовном процессе», «Материальная истина и судебные доказательства в советском уголовном процессе» і іншыя.

Асаблівым попытам сярод студэнтаў карыстаецца зборнік «Судебные речи известных русских юристов».

У кабінеце грамадзянскага права і працэса вялікую цікавасць выклікаюць паступіўшыя у гэтым годзе «Основные законодательные акты о труде рабочих и служащих», «Кодекс законов о браке, семье и опеке», «Колхозное право» і іншая літаратура.

У мэтах больш дэтальнага азнаямлення з жыццём калгаснай вёскі набыты устаў сельскагаспадарчай арцелі імя Андрэева, Несвіжскага раёна Мінскай вобласці. Веданне устава дапаможа студэнтам-пяцікурснікам пры напісанні дыпломных работ і пры вырашэнні спрэчных пытанняў у судовых працэсах па справах калгасаў.

* * *

Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў гістарычнага факультэта карыстаецца кабінет гісторыі СССР. Нядаўна сюды паступіла многа новай літаратуры, у тым ліку «Очерки по истории философской и общественно-политической мысли народов СССР» у двух тамах і «Очерки дипломатической истории русско-японской войны». Гэтыя творы дапамогуць студэнтам глыбей пазнаёміцца з айчыннай гісторыяй.

Набыта многа падручнікаў для сярэдняй школы. Імі карыстаюцца студэнты, якія праходзяць педагагічную практыку у школах.

У сучасны момант тут ідуць работы па пашырэнню кабінета.

А. АЛЕЖКА.

Студэнты 5-га курса аддзялення журналістыкі праходзяць практыку у рэдакцыях раённых, абласных і рэспубліканскіх газет.

НА ЗДЫМКУ: Выпускніцы Т. Банькоуская і Н. Дарашэнка праглядаюць свой матэрыял перад выхадам чарговага нумару «Знамени юности».

Фото М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Выстаўка па гісторыі друку

Наведваючы кабінет друку, студэнты часта спыняюцца каля вялікай, займаючай амаль усе сцены, ілюстраванай выстаўкі, прысвечанай гісторыі развіцця комуністычнага друку у Расіі. Выстаўка гэтая падрыхтавана вясной мінулага навучальнага года.

Большасць матэрыялаў выстаўкі расказваюць і наглядна ілюструюць развіццё комуністычнага друку у Расіі ад самага пачатку яго узнікнення і да Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Тут маюцца фотаграфіі асобных нумароў першых рабочых газет, лістовак, пракламацый, якія у той час выходзілі ў падполлі. Немалое месца займаюць тут фотакопіі рукапісаў работ вядомых рэволюцыйных дзеячоў таго часу. Ёсць і фотакопіі работ В. І. Леніна.

Па меры таго, як будуць паступаць новыя матэрыялы па гісторыі друку выстаўка будзе сістэматычна аднаўляцца. У хуткім часе ў ёй будзе адлюстравана развіццё сучаснага совецкага друку. Матэрыялы для гэтага ужо збіраюцца.

В. САЛДАТКІНА,
лабарантка кабінета друку.

НОРМА ВЫКАНАНА!

На вуліцы па-асенняму свежая раніца. Ветру няма, але холадна. І не таму холадна, што прыйшоў гэтаму час. Проста крынічная вада абпальвае расчырванелы твар, рукі, шыю.

— Ху-у-г,—Сямён Кручок урываецца у пакой.—Як хораша! Быццам дома у Стаўбцах.

Яго таварышы ажыўлена размяшчаюцца за сталом. Вось, цяпер, умыўшыся, усе не супраць добра паснедаць. Тым больш, што над гарачай бульбай ужо узнімаюцца клубы пары.

Яны, пяцёра моцна пасябраваўшых хлапцоў, спяшаючыся крочаць па прасёлачнай дарозе. Справа засталося бульбяное поле. Вунь там хтосьці з дзяўчат нешта крыкнуў і ў знак прывітання узмахнуў кашом. Працоўны дзень пачаўся.

Тарахценне матора заглушае размову хлапцоў. Адзін, два, тры абароты і ужо не злічыць. Бульбянік плыве ў сіласарэзку. Віктар Бачыла, самы высокі хлапец, спрытна арудуе віламі. Не адстае ад яго і Ігар Афнагель, той самы, якога кіраўнік Раман Пракоп'евіч хацеў адправіць у Мінск толькі таму, што ён прыехаў у калгас без шапкі. Валодзя Маліноўскі, які паступіў ва універсітэт з срэбраным медалем, прымасціўся у самага жолаба. Шпаркімі рухамі ён накіроўвае пад нож адну партыю бацвіння за другой. Ад працы робіцца значна цяплей—і Сямён Кручок скідвае з сябе целагрэйку. Закасаўшы рукавы, ускаквае на толькі-што падышоўшую падводу.

— А ну, хлопцы, паднаціснем!

Ад зладжанай працы павесялелі вочы у Нікалая Салауя. «Зусім як дома». — думае ён і падналягае на вілы. Добра, з энергіяй працуюць пяцёра таварышаў і сярод іх Нікалаў Салавей, які прыехаў вучыцца з усім вядомага калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Не прайшло нават дваццаці мінут, як апусцелі чатыры падводы. Затое у сіласнай яме «прыбыло».

— Арлы, а не хлопцы,—з такой пахвалой адзываецца аб іх пажылы машыніст сіласарэзкі Н. Р. Вайцехоўскі.

Такой-жа думкі аб іх працы і на збожжаскладзе, дзе яны ужо некалькі разоў працавалі ў час дажджу. Добрым словам успамінаюць комсамольцаў і тыя, хто разам з імі у пагодлівыя дні убіраў авёс.

А цяпер заглянем на бульбяное поле. Яно раскінулася на вялікай плошчы паміж доугімі-доугімі радамі яблынь маладога саду. Роўным ланцужком выстраіліся пятнаццаць дзяўчат, студэнтак І курса геаграфічнага факультэта. Ніне Махлай не трэба вучыцца працаваць у полі. Як і Нікалай Салавей, яна прыехала сюды з «Рассвета». У яе руках работа проста спорыцца. Праходзяць якія-небудзь лічаныя мінуты і вось яе канец убраны. Калі з другога боку града не ворная, Ніна не садзіцца адпачываць, а дапамагае суседкам.

А вось, амаль ля самай дарогі, якая вядзе ад шашы ў вёску Круціца, відаць дзве неспакойныя фігуры. Гэта Ларыса Дробыш і Людміла Сташонак. Жыццерадасныя, энергічныя дзяўчаты нават у дажджлівае надвор'е знаходзяць месца жартам. Працуюць яны спорна, з запалам. А самае галоўнае: бульбу ўбіраюць чыста, як клапатлівыя гаспадыні на прысядзібным участку.

— Саша, скрыню,— крычыць Людміла запозненаму возчыку Аляксандру Лагацкаму. Яна легка падхоплівае кош і спяшыць насустрач.

Праходзіць яшчэ некалькі мінут і зноў у воз сыплюцца буйныя клубні бульбы.

За дзяўчатамі бяжыць доўгая узараная града. Белымі вочкамі выглядаюць з зямлі бульбіны, іх схватваюць дзявоцкія рукі і... гэтак з рання да самага вечара. Толькі часам раздаецца вокліч: «Скрыню!» і зноў, як мурашкі на сваёй сцежцы шавеляцца клапатлівыя студэнты. Ліна Турбан апаражніла сваё вядро і зноў за справу. А паспрабуйце угнацца за Тамарай Грамадскай! Яна нібы прырасла да зямлі, працуе без стомы. Ды і Галя Паулава не з тых, хто чакае пакуль сонца за лес зойдзе. Праўда, спачатку у яе крыху не клеілася, затое цяпер гэтага ужо не скажаш.

У мінулыя дні Святлана Крупянкова адставала ад сваіх сяброўак. Атрымлівалася так, што раптам захочацца сесці адпачыць. Ну, хоць-бы на поўмінуткі! А у гэты час, вядома, другія ужо справяцца са сваімі канцамі і зноў бліскучы лямех развальвае граду... Затрымка. Сварка з маладым аратым. Ды і суседкі непахвальна паглядаюць на дзяўчыну, ды калі яшчэ скажуць: «Пасля цябе, Светка, нават трактару не пад сілу будзе зямлю узараць!» Светлана загарыцца чырванню, ускочыць з таго месца, дзе толькі што сядзела, абапершыся на кош, і, не кажучы ні слова, бярэцца за працу. А цяпер другая справа. Сёння, напрыклад, яна не адстае ад сяброўак, з якімі жыве у адным пакоі. Не, цяпер яна паспаборнічае і з Рытай Марунічавай, і з Тамарай Сіневіч, і з другімі аднакурсніцамі.

Люба Гарбачэнка і Нона Зайко працуюць поплеч. У іх таксама справа спорыцца. Асабліва ў Любы. Гэта аб ёй калгаснікі сказалі: «Працуе вельмі добра!» І цяпер, прыгледзеўшыся да рытмічных рухаў яе рук, міжвольна думаеш: «Як многа можа зрабіць чалавек, калі захоча!» Гарбачэнка—дзяўчына з горада. Яна нарадзілася, вырасла і атрымала сярэднюю адукацыю у Магілёве. А паглядзіце, як яна слаўна працуе. Іншым вясковым дзяўчатам ёсць чаму павучыцца ў яе, Любы Гарбачэнка.

Вечарэе. Зноў стала халаднавата. Па шырокаму полю разгульвае вецер, налятае на дзявочыя касынкі і хусткі, зрывае пажаўцелыя лісты з маладых фруктовых дрэў. У апошні раз праншоў араты, наваліўшыся грудзінай на плуг. Падабрана уся бульба і вось апошні кош акуратна высыпаюць на калёсы Люба Гарбачэнка і Нона Зайко. Цяпер у вёску. Перад калгаснікамі сорамна не будзе—норма выканана!

НА ЗДЫМКАХ: 1. Студэнты 1-га курса геаграфічнага факультэта працуюць на сіласарэзцы. Уверсе (злева направа): Ігар Афнагель, Нікалай Салавей, Уладзімір Маліноўскі, Сямён Кручок і Віктар Бачыла.

2. Люба Гарбачэнка і Нона Зайко высыпаюць у скрыню апошні кошык бульбы.

3. Людміла Сташонак і Ларыса Дробыш на калгасным полі.

Фотарэпартаж М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ПЕРШАКУРСНІКІ ВЫВУЧАЮЦЬ АНАТОМІЮ РАСЛІН

Наталля Сцяпанауна на мінуту пакідае лабараторыю, каб прынесці некалькі нехапаючых прыбораў. Аудыторыя адразу-ж напаўняецца галасамі. Дзяучаты падбягаюць да суседніх сталоў і цікавяцца, што зрабілі сяброўкі. Да светлавалосай студэнткі з чырвоным банцікам у косах падыходзіць суседка і пляскае рукамі:

— Дык у цябе-ж атрымаліся камячкі, трэба перарабіць!

Уваходзіць Наталля Сцяпанауна. Яна уважліва разглядае прэпараты, падрыхтаваныя студэнткамі, указвае на памылкі, дае парады.

— А цяпер паглядзіце у мікраскопы,—гаворыць яна, і трынацаць дзяучат нахіляюцца над сталамі, разглядаючы праз мікраскопы падрыхтаваныя з кавалачкаў бульбянога клубня прэпараты.

— Пачынайце замалёваць,— зварочваецца кіраунік да групы.

Дзяучаты зноў уважліва глядзяць у мікраскопы. На чыстых лістах альбомаў з'яўляюцца першыя штрыхі.

— А чаму гэта ў мяне зярняты варушацца? Вось зусім зніклі,— здзіўлена гаворыць Ала Філіповіч.

— Таму, што вельмі многа вады наліта на прадметным шкле, вось кропля з прэпаратам і дрыжыць ад штуршкоу,—паясняе Наталля Сцяпанауна.

— А у гэтай студэнткі, наадварот, нехапае вады. Зярняты засохлі і патрэскаліся, форма іх змянілася. Трэба абавязкова усё перарабіць.

У альбомах студэнтак з'яўляюцца акуратныя замалёукі. Але не

усе дакладна перадаюць тыя памеры зярнят, якія яны бачаць у мікраскопе. Кіраунік папрауляе іх, вучыць з першых заняткаў прывыкаць да акуратнасці і дакладнасці.

Празвінеў званок. Але студэнткі застаюцца на месцах, захопленыя сваёй працай. Кожная мінута заняткаў прыносіць першакурснікам многа новага і карыснага. Яны набываюць веды, якія спатрэбяцца ім у будучым.

А. СЦЕПАНЕНКА.

НА ЗДЫМКУ: студэнткі I курса біялагічнага факультэта (на пярэднім плане Эльвіра Шушкіна і Валя Монава) на практычных занятках.

Фота Э. Дамарацкага і П. Беражкова.

Другі раз прыходзяць студэнткі першага курса біёлага-глебавага факультэта у лабараторыю анатоміі раслін. Тэма іх заняткаў— «Вывучэнне будовы запасных пажыуных рэчываў». Пад кіраунiцтвам кандыдата навук Н. С. Суднік яны пазнаюць многа новага і цікавага.

Пасля тлумачэння аб тым, якую карысць у прамысловасці прыносіць мікрааналіз крахмальных зярнят, кіраунік заняткамі паказвае спосаб падрыхтоукі прэпарата. І вось ужо кожная з студэнтак бачыць праз мікраскоп павялічаны малюнак крахмальных зярнят.

— Вельмі добра атрымалася,— гаворыць Наталля Сцяпанауна, затрымліваючыся ля століка, за якім працуе Галіна Дашкевіч.— Якое павелічэнне?

— У 600 разоу,—адказвае студэнтка.

Падарожжа вакол Еўропы

— Зірніце направа, вы убачыце самы вядомы дом у Амстэрдаме.

Але мы нічога асаблівага не заўважылі. Там стаяў дом, падобны на многія іншыя дамы. Тады экскурсавод дадала:

— Гэта дом старых халасцякоу.

Мы паплылі па заліву Амстэрдамскага парта, дзе стаяла многа караблёу амаль з усіх краін свету. Раптам прысутныя захваляваліся: на адным з караблёу мы убачылі чырвоны флаг. Гэта быу наш совецкі цеплаход «Калуга». За тысячы кілометрау мы убачылі сваё роднае судно. Якая гэта была радасць!

Пасля прагулкі па гораду, мы паехалі на аутобусах у Гаагу. Там наведалі Палац Міру, пабудаваны у своеасаблівым галандскім стылі, агледзелі будынак парламента, Каралеускага палаца. Экскурсавод давала нам падрабязныя тлумачэнні. Яе каментарыі выглядалі так: «Зірніце направа, вось дом каралевы Юліаны. Бачыце, колькі золата на яе балконе? Яна і ездзіць у залатой карэце». «Першы улоу новай сялёдкі адпраўляюць каралеве, а потым засаліваюць для іншых мэт» І крыху пазней: «У нас ёсць беспрацоуныя. У Галандыі цесна, і галандцы часта эмігрыруюць у іншыя краіны».

Агледзеушы Гаагу, мы паехалі у маляунічы рыбацкі пасёлак Шэвенінген.

Вярнуушыся на цеплаход, мы спявалі рускія, беларускія і украінскія народныя песні. Экскурсавод расказала нам, з якім поспехам выступалі у Галандыі совецкія артысты. На канцэрты нашага танцавальнага калектыва «Бярозка» нельга было дастаць білеты. У тэатры, дзе выступалі совецкія артысты, было перапоунена.

З расказу экскурсавода мы даведаліся, што у галандскіх вёсках налічваецца да 5 і больш тысяч жыхароу. Але у вёсках няма нават кіно, і каб прагледзець кінофільм, трэба ехаць у горад.

Першы універсітэт у Галандыі да гэтага часу знаходзіцца у манастыры, за вучобу у ім трэба плаціць вельмі многа грошай.

Вечарам, цёпла развітаушыся з гасціннай Галандыяй, з працалюбівым галандскім народам, мы адплылі да берагоу Францыі. Наш цеплаход праплыу уздоуж берагоу Бельгіі і Францыі па Пауночным моры і праліву Па-де-Кале. Хутка мы убачылі берагі Францыі, порт Гавр. На прыстані было многа народу. Яны ветліва махалі нам рукамі і хусткамі. А калі цеплаход прычаліу да прыстані, нас арганізавана прыйшлі сустракаць дзеці. Мы уручылі ім падарункі, сувеніры, пачастункі. У гэты-ж дзень мы прыехалі ў Парыж.



На вакзале было многа сустракаючых. Парыжане вельмі цёпла сустрэлі совецкіх турыстаў. Пасля ветлівай сустрэчы на вакзале мы накіраваліся у гасцініцы. А вечарам гуляліпа Парыжу, гораду, аб якім В. В. Маякоускі сказаў: «Я хотел бы жить и умереть в Париже, если-б не было такой земли—Москва».

НА ЗДЫМКУ: г. Амстэрдам.

А. С. ЛАКІЗА,
кандыдат філасофскіх навук.

(Працяг будзе)

Умацаваць сувязь навукі з сельскай гаспадаркай

Задачы далейшага развіцця сельскай гаспадаркі у нашай краіне патрабуюць значнага паляпшэння навукова-даследчай работы, павышэння ролі сельскагаспадарчай навукі ва усенароднай барацьбе за круты уздым земляробства і жывёлагадоўлі.

Навуковыя работнікі, апіраючыся на матэрыялістычную тэорыю і перадавую практыку сацыялістычнага будаўніцтва, праклалі новыя шляхі для вырашэння многіх практычных задач у сельскай гаспадарцы і, тым самым, садзейнічалі росту ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, прадукцыйнасці жывёлагадоўлі і павышэнню прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы.

Аднак у сучасных умовах, калі перад сельскай гаспадаркай пастаулены новыя вялікія задачы па павелічэнню вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў, роля сельскагаспадарчай навукі непамерна ўзрастае, а патрабаванні да навуковых работнікаў павінны быць значна павышаны.

Вялікім недахопам работы большасці навукова-даследчых устаноў у галіне сельскай гаспадаркі з'яуляецца тое, што інстытуты, вопытныя станцыі і асобныя вучоныя усё яшчэ слаба звязаны з калгасамі, МТС і соўгасамі, не аказваюць патрэбнай дапамогі практычным работнікам у распрацоуцы мерапрыемстваў па ўздыму сельскай гаспадаркі.

У мэтах павышэння навуковатэарэтычнага ўзроўню даследаванняў у галіне сельскай гаспадаркі біялагічны факультэт універсітэта павінен наблізіць іх да вырашэння актуальных навуковых пытанняў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Навуковыя даследаванні па пытаннях сельскагаспадарчай вытворчасці на біёлага-глебавым факультэце нашага універсітэта вядуцца кафедрамі сістэматыкі раслін, глебазнаўства, фізіялогіі раслін, дарвінізма і генетыкі.

Калектыў кафедры сістэматыкі раслін займаецца распрацоукай спосабаў барацьбы з узбуджальнікамі хвароб сельскагаспадарчых культур, як, напрыклад, бульбы, канюшыны, люпіну, цукровых буракоу і кукурузы. Па гэтаму разделу навукі намі апублікавана адна манаграфія, шэраг навуковых артыкулаў і брашур, напісана і абаронена некалькі кандыдацкіх дысертацый.

Работнікамі кафедры сумесна з аддзелам фітапаталогіі Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства распрацавана сістэма мерапрыемстваў па барацьбе з фітафторай бульбы у калгасах і соўгасах БССР. Сёлета гэтая работа у парадку укаранення апублікавана масавым тыражом праз Беларускае навукова-тэхнічнае грамадства сельскай і лясной гаспадаркі. Частковае укараненне гэтай сістэмы праведзена пад кіраунiцтвам работнікаў кафедры сістэматыкі раслін у калгасе «Новый быт» і імя Гастэла, Мінскага раёна, дзе ў выніку укаранення атрымана прыбаука ураджая з кожнага гектара да 5 тон клубняу бульбы на плошчы 260 гектараў. У гэтым годзе работа па укараненню праводзіцца у нашым падшэфным калгасе «Камінтэрн», Дзержынскага раёна. Акрамя таго, кафедра сістэматыкі раслін разам з Навукова-даследчым інстытутам земляробства і Усесаюзным інстытутам грамадзянскай авіацыі праводзіць у гэтым-жа калгасе дадатковыя даследаванні па прымяненню сельскагаспадарчай авіяцыі ў барацьбе з хваробамі бульбы.

Кафедрай глебазнаўства праведзена вялікая работа па складанню глебавых карт калгасаў зоны дзейнасці Фаніпальскай МТС (прафесарам І. Г. Майсеевым, дацэнтам Н. П. Булгакавым). Наяунасць глебавых карт у калгасах дазваляе правільна будаваць земляробства—размяшчэнне сельскагаспадарчых культур, дыферэнцыравана прымяняць угнаенні і агратэхніку.

Практычна важныя пытанні распрацоўвае дацэнт С. В. Калішэвіч па пытанням распрацоукі мер барацьбы з паляганнем зернавых культур.

Трэба адзначыць, што кафедры, якія распрацоуваюць пытанні уздыму ураджайнасці сельскагаспадарчых культур, свае даследаванні вядуць разрозпена і далёка недастаткова звязана з вытворчасцю, слаба займаюцца укараненнем дасягненняў навукі у вытворчасць.

Тэматычныя планы кафедр актуальныя, большасць дыпломных і курсавых работ выконваюцца у калгасах і на вопытных станцыях. Тэмы дыпломных і курсавых работ таксама актуальныя. Аднак адсутнасцю комплекснасці ў даследаваннях, распыленасцю работнікаў па асобным тэмам, адсутнасцю адзінага кіраунiцтва можна растлумачыць той факт, што калектыу біёлага-глебавага факультэта да гэтага часу не выступіў з буйнымі прапановамі па пытанням развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Значным недахопам з'яуляецца і тое, што Вучоны совет прыродазнаучых факультэтаў самаухіліуся ад кіраунiцтва навукова-даследчай работай факультэта.

На факультэце адсутнічаюць нармальныя умовы для вядзення навукова-даследчай работы у галіне сельскай гаспадаркі. Няма добра абсталяванай базы, цяпліц, вегетацыйнага доміка, добра абсталяваных лабараторый і тэхнічнага персаналу.

Кіраунiцтву універсітэта трэба больш рашуча ставіць перад Міністэрствам вышэйшай адукацыі пытанне аб выдзяленні сродкаў на сучаснае абсталяванне, на будаунiцтва цяпліц, аранжэрэй, што дазволіць шырока укараніць новыя метады даследавання і даваць буйныя прапановы як практычнага, так і тэарэтычнага характару.

Неабходна рашуча палепшыць выданні работ. Каля двух год у выдавецтве універсітэта ляжаць навуковы артыкул кандыдата біялагічных навук В. К. Гаравец, па вельмі актуальнаму пытанню: барацьба з цэркаспарыёзам цукровых буракоу. Тое-ж самае было і з брашурай па хваробах цукровых буракоу.

Публікацыя дасягненняў навукі—адзін з метадаў іх укаранення. Выдавецтвам універсітэта павінны выдавацца работы па ўкараненню навейшых метадаў даследаванняў, навейшым дасягненням навукі, прапановы па укараненню, і толькі тады на складах універсітэта не будзе залежвацца літаратура.

Кіраунiцтву універсітэта неабходна прыняць неадкладныя меры для вырашэння гэтых важных задач. **Праф. Н. А. ДАРОЖКІН.**

«БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
№ 8 стар. 22 верасня 1956 г.

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ МІНСКАГА РАЁНА

* * *

У КАЛГАСЕ „СТАЛІНСКІ ШЛЯХ“

* * *

Браць прыклад з лепшых

200 цэнтнерау бульбы у сярэднім з кожнага гектара! Убраць такую колькасць гэтай каштоунай спажыунай і тэхнічнай культуры—не жартачкі! Ды і пасеяна, да таго-ж, яе у калгасе «Сталінскі шлях» нямала—у адной толькі першай брыгадзе 36 гектарау. Таму кіпіць зараз на палях напружаная праца: калгаснікі імкнуцца як мага хутчэй завяршыць уборку усіх сельскагаспадарчых культур. Немалую дапамогу аказваюць ім у гэтай справе прыехаушыя сюды студэнты нашага універсітэта.

У калгас «Сталінскі шлях» на дапамогу хлебаробам прыехала 107 студэнтау з 2-га і 3 курсау хімічнага факультэта БДУ. Вось ужо больш тыдня працуюць яны у сельгасарцелі.

Студэнты выконваюць тут розныя неадкладныя сельскагаспадарчыя работы: капаюць бульбу, сушаць і ачышчаюць зерне, здрабняюць на сілас зялёную масу, удзельнічаюць у будаунцтве грамадскіх памяшканняу. Працуюць хімфакауцы у асноуным нядрэнна, так што калгаснікі не скардзяцца на іх.

— Добрых студэнтау да нас прыслалі,—гавораць хлебаробы.,— не гультаёу, не беларучак. Ёсць тут такія, што яшчэ лепш за калгаснікау працуюць. Вунь, напрыклад Рабцэу Коля, што у першай брыгадзе. Калі ён рауную бульбу у капцах, то паглядзець на яго прыемна—так у яго усё хутка і удала атрымоуваецца!

І гэта сапрауды. Многія студэнты працуюць у сельгасарцелі так, што могуць служыць прыкладам для калгаснікау. Вось, напрыклад, толькі добрым словам адзываюцца члены сельгасарцелі аб студэнтах 3-га курса, якія працуюць у трэцяй брыгадзе (кіраунікам там студэнтка Ламейка). Нарауне з калгаснікамі выконвае дзённую норму выпрацоукі трэцекурсніца Падчуфарава (1-я брыгада), узоры працы паказвае другакурснік Хадакоу.

Аднак, «у сям'і не без выradка», як кажуць. У той час, як лепшыя студэнты стараюцца добра працаваць, высока трымаючы гэтым гонар нашага універсітэта, завяліся тут і такія, хто адчувае сябе у калгасе, нібы у гасцях. Вось, напрыклад, што адбылося у другой брыгадзе, дзе працуе група студэнтау другога курса хімфака. Улічваючы, што стаць добрае надвор'е, хімфакауцы разам з калгаснікамі рашылі працаваць і у нядзелю, 16 верасня, тым больш, што перад гэтым цэлы дзень не рабілі з-за дажджу. Аднак, у нядзелю на работу выйшлі толькі хлопцы. Дзяучаты-ж, 10 чалавек, паехалі у Мінск і вярнуліся назад к вечару. А двое з іх, Левіна і Рэут, пажадалі вярнуцца у калгас толькі у панядзелак, у другой палове рабочага дня.

Сталі нярэдкімі у апошні час выпадкі, калі студэнты вечарам едуць у Мінск—да яго недалёка. Такія таварышы думаюць, напэўна, што яны прыехалі у калгас на кароткатэрміновыя «гастролі». Гэтыя «гастралёры» ганьбяць імя нашага універсітэта, з-за іх кладзецца пляма і на добрасумленных і працавітых студэнтау.

Здараецца таксама, што асобныя хімфакауцы позна выходзяць на работу, не падпарадкоуваюцца распараджэнням брыгадзіра, утвараюць з ім частыя «дыскусіі» і «спрэчкі». Усё гэта, безумоуна, адмоуна уплывае на прадукцыйнасць працы.

— Але прадукцыйнасць нашай працы магла-б быць большай, каб не было розных непаладкау арганізацыйнага характару, — гаворыць кіраунік хімфакауцау дацэнт В. Ф. Бяляеу.—Асабліва гэтыя непаладкі праяуляліся у першыя дні нашай работы. Выйдуць, бывала, студэнты капаць бульбу, а ім то кошыкау нехапае, то калгаснікі не забяспечаць своечасовую адвозку накапанай бульбы. А было, нават, што студэнты прыйшлі на поле, а калгаснікі з'явіліся туды толькі значна пазней.

Далей, безумоўна, так быць не павінна. Хімфакауцы павінны паказваць прыклад у рабоце, павінны арганізаваць яе так, каб на іх нараканняу з боку калгаснікау не было. Браць прыклад з лепшых—такая у іх зараз асноуная задача.

Г. ГЕОРГІЕЎ.

Гультаёў нам не трэба!

Хачу і я расказаць некалькі слоў аб студэнтах, якія працуюць цяпер у першай паляводчай брыгадзе калгаса «Сталінскі шлях» (я працую брыгадзірам у гэтай брыгадзе). Прыслалі сюды 36 чалавек з 2-га і 3-га курсау хімічнага факультэта універсітэта. Размясціліся усе добра, ежай забяспечаны як трэба. Усе умовы для добрай працы, здаецца, створаны.

А як працуюць студэнты? У асноўным нядрэнна. Пра рэбят, напрыклад, нічога дрэннага сказаць не магу. Што ні скажаш зрабіць, выканаюць хутка, старанна, ахвотна. Асабліва добра працуюць Нікалай Гарбуз, Нікалай Рабцэу і іншыя.

А дзяўчаты? Большасць з іх таксама стараецца добра працаваць. Вось, хаця бы, студэнтка Падчуфарава. Усе дзяўчаты становяцца па дваіх на адну баразну, а яна адна цэлы радок выбірае. Ёсць і яшчэ нямала дзяўчат, якія шчыра імкнуцца працаваць і робяць нядрэнна.

Але так не ўсе. Ёсць тут і такія, што не прайшло і тыдня, а яны ўжо на работу пачынаюць не выходзіць. Так, вось, захацелася Людзе Высоцкай у Мінск, дык яна і паехала, нягледзячы на тое, што кіраўнік студэнтаў тав. Беляеў ёй гэтага не дазволіў.

Быў яшчэ такі выпадак: дагаварыліся мы, што у нядзелю будзем працаваць. Таму паехалі вечарам у суботу дзяўчаты у Мінск. Раніцой на другі дзень прыехалі, дзве гадзіны папрацавалі, а пасля абеда не прыйшлі. Чаму? Ізноў у Мінск паехалі. А на тое, што іх калгаснікі ў полі чакалі, што барозн ім разагналі, што надвор'е добрае было, што работа стаяла, увагі дзяўчаты не звярнулі.

А то бывае і так: скажаш ім што-небудзь зрабіць, а яны як пачнуць спрачацца і аднеквацца, дык хоць з поля уцякай, бо дзе-ж ты з васемнаццаццю вострымі языкамі справішся.

А так рабіць не трэба. Мы бачым і шануем шчырую дапамогу, цэнім яе. Калі-ж хто прыехау у калгас не дапамагаць, а ў госці быццам, то няхай забудзе пра свае намеры адпачыць, няхай не дае гэтым нядобры прыклад астатнім, няхай з-за яго на другіх, старанных, не наракаюць. А тых, хто добра працуе, мы з ахвотай будзем чакаць у госці ў другі, больш свабодны час. Гультаёу-жа нам не трэба.

І. СУШЧЫНСКІ,
брыгадзір 1-ай паляводчай брыгады.

ЗАЛАТЫЯ РУКІ

Шаравары, спартыуныя куртки адразу выдаюць студэнтау. А дзяучат аддзялення матэматыкі першага курса фізіка-матэматычнага факультэта выдае яшчэ і выдатная праца.

— Вы пытаеце, ці ёсць у нашай брыгадзе студэнты,—паутарылі наша пытанне калгаснікі трэцяй паляводчай брыгады сельгасарцелі «ІЛЬІЧ».—А як-жа, безумоуна, ёсць. Добрая, працавітая моладзь!

Колькі удзячнасці, цеплыні, гонару у гэтых простых словах! Таму пашану працаўшкоу калгасных палёу студэнткі-першакурсніцы заслужылі добрасумленнай працай на плантацыі хмелю.

На двух гектарах паспелі шышкі хмелю. А людзей на плантацыю паслаць нельга, усе заняты уборкай збожжавых культур. Дзе-ж узяць людзей?—ужо не першы дзень думау брыгадзір Іван Іларыёнавіч Сцефановіч. І калі прыехалі у брыгаду пасланцы універсітэта, брыгадзір цвёрда выразіу: студэнтау пашлем.

Ніхто з дзяучат ранен не збірау хмелю. Многія нават не ведалі, дзе і як ён расце. Таму усе з вялікай увагай праслухалі тлумачэнні звеннявой Ольгі Васільеуны Грыб—першую лекцыю, як потым жартавалі студэнткі. Звеннявая растлумачыла, як здымаць галінкі хмелю, абрываць шышкі. Аказваецца, яго збор мае многа агульнага з арэхамі. Шышкі хмелю падобны на гнёзды арэхау. Толькі арэхау бывае па некалькі у адной шышцы, а хмелю—адна. Ну, збор арэхау Валі Пісарчык вядомы. Сярод арэхау-жа расла! Але што гэта? Шышкі зусім лёгкія.

— Дзяучынкі, яны-ж пустыя,— са здзіуленнем прагаварыла Валя, абарваушы некалькі шышак.

Ольга Васільеуна засмяялася:

— Толькі гэтым яны і не падобны да сапраудных арэхау. Ды і смак у іх не арэхавы.—І, памаучаушы, сур'ёзна дадала:

— Такіх вось легкіх шышак кожнай з вас патрэбна па шэсць кілограмау за дзень сабраць.

Галя Шайхуліна нездарма выбрала сабе спецыяльнасць матэматыка. Узважыушы шышку на руцэ, дзяучына у роспачы прагаварыла:

— Ды яны-ж важаць не больш 0,1 грама!

Але бойкая Валя ужо затармашыла галінку хмелю:

— Пасля будзем важыць,—рашуча сказала яна.—А цяпер—за працу.

У канцы дня падвялі вынікі. Па 5 кілограм абарвалі дзяучаты хмелю. На другі дзень лік збору падняуся да нормы. А у трэці—быу астаулен рубеж 6 кілограм. Самым рэкордным быу пяты дзень—па 8,5 кілограм сабралі студэнткі. А на наступны дзень збор хмелю з усёй плантацыі у 2 гектары быу закончан.

— Залатыя у вас рукі, дзяучаткі,—прагаварыла расчуленая звеннявая.

Н. НІКАЛАЕЎ.
Калгас «Ільіч»,
Круліцкага сельсовета.

У ДРУЖНЫМ КАЛЕКТЫВЕ

Працуем мы у адной з паляводчых брыгад калгаса імя Войкава. Група у нас невялікая—усяго 15 чалавек. За кароткі час мы здолелі агульнымі намаганнямі стварыць добры, дружны і працавіты калектыу.

Сустрэлі нас нядрэнна. Хутка уладкавалися і у першы-ж дзень прыезда пасля абеду працавалі на уборцы бульбы. Працаваць давадзілася не толькі на копцы бульбы, але і на іншых сельскагаспадарчых работах. Асабліва калі дажджлівае надвор'е. Працавалі мы ужо і на ачыстцы зерня і на нарыхтоуцы сіласу.

Дзе б не даводзілася нам працаваць, мы заусёды імкнемся пакомсамольску выканаць свой абавязак. Працоуны дзень пачынаецца у нас у 9 гадзін раніцы і працягваецца да 8—9 гадзін вечара. Пакуль яшчэ цяжка сказаць, вялікая ці не наша дапамога у калгасе, але нам вельмі прыемна, што калгаснікі адклікаюцца аб нас добра. Для нас гэта лепшая узнагарода за працу.

Асабліва добра працуюць у нас Іван Ігнатовіч, Валянціна Шыбко і іншыя.

А. АМБРАЖЭВІЧ,
студэнтка II курса аддзялення метэматыкі.

Калгас імя Красіна—буйная гаспадарка ў Мінскім раёне. Сёлета тут вырашчан багаты ўраджай бульбы, гародніны і іншых сельскагаспадарчых культур. Тэрмінова і без страт убраць усё з палёў—першаступенная задача працаўнікоў калгаснай вёскі. Вялікую дапамогу калгаснікам ва ўборцы багатага ўраджаю аказваюць студэнты універсітэта. Разам з хлебаробамі выходзяць яны на полі, разам з імі працуюць тут, не шкадуючы сваіх рук. Усе ведаюць, што кожная мінута, якую ўдалося зберагчы на уборцы ўраджаю, дасць сельгасарцелі немалы прыбытак.

У другой паляводчай брыгадзе, якая размешчана ў вёсцы Ніжняе Сіняло працуюць студэнты 4 курса аддзялення рускай мовы і літаратуры. Добрым словам адзываюцца аб іх калгаснікі.

Кіпіць праца ў маладых руках, не паспееш аглянуцца, як кошык зноў напоўнен выбранай бульбай. Яе згружаюць у воз, які зараз-жа адвозіць бульбу ў капцы.

НА ЗДЫМКУ: Студэнткі выгружаюць выбраную бульбу.

Фота Г. Праваловіча.

Уменне спатрэбіцца ўсюды

Хаця і працуюць студэнты ў нашым калгасе ўсяго некалькі дзён, аднак ужо зараз можна сказаць, што гэта працавітая моладзь.

У гэтыя дні уборку бульбы ў нашай брыгадзе яшчэ не пачыналі, пагэтаму усім даводзіцца працаваць на розных іншых сельскагаспадарчых работах: уборцы збожжа, малацьбе, вывазцы снапоу на крытыя такі і г. д.

Прыемна адзначыць, што на усіх гэтых участках студэнты працуюць вельмі добрасумленна. У сваёй працы яны ніколі не уступаюць калгаснікам, а часта паказваюць узоры самаадданай працы. Няхай у іх не заусёды так добра і умела атрымоуваецца, як у калгаснікау, але важна іншае: працавітасць, імкненне і дысцыпліна. Ды і вынікі працы у студэнтау не дрэнныя.

Усё гэта дае мне падставы праз вашу газету ад імя хлебаробау першай паляводчай брыгады калгаса імя Кірава горача падзякаваць студэнтау 4 курса аддзялення матэматыкі за іх добры пачатак у працы. Мы выказваем упэўненасць, што яны будуць і у астатнія дні работы працаваць таксама добра, як і пачыналі.

І. ЛАМАКА,
брыгадзір 1-й паляводчай брыгады сельгасарцелі імя Кірава Мінскага раёна.

«БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
22 верасня 1956 г. 3 стар.

У біялагічным корпусе часта можна бачыць групы студэнтаў ля карты новабудоўляў шостай пяцігодкі. Карта гэтая зроблена з вячэрнім асвятленнем. На ёй наглядна абазначаны месцы буйнейшых новабудоўляў: металургічныя заводы, электрастанцыі, новыя чыгункі, арашальныя каналы і г. д.

НА ЗДЫМКУ: студэнты знаёмяцца з важнейшымі гідразбудаваннямі шостай пяцігодкі.

Фота З. Дамарацкага і П. Беражкова.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

ПАПРАЎКІ Ў ТАБЛІЦЫ РЭКОРДАЎ УНІВЕРСІТЭТА

Два дні, 15 і 16 верасня, на стадыёне «Дынама» праходзілі спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на першынство абласнога совета «Буравеснік». У гэтых спаборніцтвах прынялі удзел і вядучыя спартсмены універсітэта, выступаючыя у асабістым першынстве.

Нашы легкаатлеты паказалі нядрэнныя вынікі, многія з якіх перавышаюць ранейшыя рэкорды універсітэта.

У спартыунай хадзьбе на 10000 метрау першае месца заняў студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Аркадзіи Прановіч. Ад старта і да фініша ішоу ён першым. Яго час—46.06,6 сек. Гэта на 13,4 сек. лепш ранейшага рэкорда на гэтую дыстанцыю.

З 1953 года нікому не удавалася пабіць рэкорд Тамары Гароховай у бегу на 400 метрау—1.05,0 сек. Гэта удалося зрабіць толькі 16 верасня здольнай спартсменцы біёлага-глебавага факультэта Зоі Духоускай. Новы рэкорд цяпер 1. 04, 9 сек.

Парадаваў добрымі вынікамі першакурснік фізіка-матэматычнага факультэта Уладзімір Сіуцоу. Ён штурхнуу ядро на 12 метрау 56 см--новы рэкорд універсітэта. Нядрэнны вынік па прыжках у даужыню і трайному прыжку з разбегу паказау яшчэ адзін першакурснік хімічнага факультэта Уладзімір Гараеу. Трэцяе месца у бегу на 100 м заняу Уладзімір Ціток, пятае па мятанню дыска—Слава Чэмерыцкі. Трэцім у забегу на 800 метрау быу Валерый Кіслік—2,02,6 сек.

Н. Чэхоўскі.



Адбыліся традыцыйныя спаборніцтвы каманд першых курсау па валейболу. У мужчын перамаглі спартсмены геаграфічнага факультэта, а у жанчын—валейбалісткі фізіка-матэматычнага.

Спаборніцтвы выявілі рад здольных валейбалістау, у асноуным жанчын. Гэта Галина Нікіціна (біяфак), Ларыса Іванова (фізмат), Светлана Сафронава (філфак) і іншыя. Усе яны трэніруюцца цяпер у складзе зборнай каманды універсітэта.

НА ЗДЫМКУ: Момант гульні валейбольных каманд хімічнага і філалагічнага факультэтау.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Спартсмен з хімфака

Ішоу апошні экзамен на атэстат сталасці. Вучні, цеснай ватагай сабраушыся ля дзвярэй аднаго з класау, жыва абмяркоувал: куды пайсці вучыцца.

— А ты, Лёня, у фізкультурны?—запытау бойкі хлопчык. У цябе-ж першаразрадныя вынікі па прыжках. У фізкультурны цябе возьмуць з радасцю. Пройдзеш туды без конкурса.

— Не, хлопцы, спорт для мяне толькі сродак умацавання волі, арганізма. Заяву я падам у Беларускі дзяржауны універсітэт імя В. І. Леніна.—упершыню здзівіу аднакласнікаў Леанід Станішэускі.

Таварышы Леаніда здзівіліся: хто-хто, а Леанід будзе добрым спартсменам, і, раптам,—універсітэт...

Яшчэ з шостага класа Леанід пачау займацца лёгкай атлетыкай. За гэты час ён—двойчы чэмпіён Мінска і Беларусі па трайному прыжку, прыжках у даужыню сярод юнакоу, неаднаразова біу рэспубліканскія рэкорды. Удала выступіу ён і на Усесаюзных школьных спаборніцтвах у Кіеве і Ленінградзе, дзе уваходзіу у пяцёрку мацнейшых легкаатлетау краіны. Вясной 1954 года, яшчэ будучы вучнем 42-ой школы, Леанід дабіваецца першаразрадных паказчыкау, прыгнуушы у даужыню на 6 м 78 см, а у трайным—на 14,14 м. заваяваушы 2-ое месца у Беларусі сярод мужчын.

...Колькі разоу за мінулы час на невялікім жыццёвым шляху юнака былі перашкоды. Кволаму школьніку доуга не удаваліся прыжкі, бегау ён нядрэнна, але прыгнуць далей пяці метрау не мог. Трэнер—Давід Сямёнавіч Глейберман разам з ім перажывау няудачы. Але выхад быу знойдзен.

— Усё гэта ад аднабокага развіцця,—гэтымі словамі пачау аднойчы трэніроуку Давід Сямёнавіч.—Патрэбна, Лёня, спачатку папрацаваць над развіццём сілы. Больш трэба займацца са штангай, трэніравацца на бруссях, перакладзіне, кольцах. І толькі потым зможаш перайсці на адпрацоуку тэхнікі прыжка.

Доуга і упорна займауся Леанід рознымі практыкаваннямі, паспяхова займауся у школе.

Пачаліся дні вучобы ва універсітэце. Першыя лабараторныя заняткі. Хутка ляцелі дні. Патрэбна было рыхтавацца да зімовай экзаменацыйнай сесіі. Часу на трэніроукі нехапала. І Леанід перастау хадзіць на заняткі секцыі.

Надыйшоу май,—час, калі усе спартсмены выйшлі на стадыёны, валейбольныя і баскетбольныя пляцоукі, трэкі, летнія басейны. Перад традыцыйнымі легкаатлетычнымі спаборніцтвамі на прыз адкрыцця сезону да Леаніда падыйшоу трэнер універсітэцкіх легкаатлетау В. Г. Кушнароу:

— Лёня, ты здолеу-бы выступіць за калектыу. У нас няма залковага удзельніка, а ты прыгнеш за 6 метрау.

— Не ведаю, як атрымаецца.

— Атрымаецца добра, — натхняюча адказау трэнер.

Упершыню выступіушы за студэнцкі калектыу, Леанід Станішэускі прынёс яму перамогі па прыжках у даужыню і у трайным прыжку з разбега.

У наступны вечар Леанід прыйшоу на стадыён «Дынама», сустрэуся са старым трэнерам. Першыя трэніроукі пайшлі на тое, каб аднавіць мінулую спартыную форму: давадзілася многа бегаць, рабіць за вечар да 150 прыжкоу. А пасля напружаных трэніровак зноу заняткі ва універсітэце. Вопытны трэнер вучыу юнака сумяшчаць вучобу і адпачынак. І Леанід здолеу зрабіць гэта: летняя экзаменацыйная сесія была здана на «добра» і «выдатна» вынікі па прыжках раслі. У тым-жа годзе Леанід Станішэускі становіцца чэмпіёнам Усебеларускай спартакіяды студэнтау.

... Новы вучэбны год, другі курс. Зноу заняткі, трэніроукі. З ранейшай настойлівасцю удасканальвае легкаатлет тэхніку прыжка. Настойліва працуе. Расли вынікі, на трэніроуках неаднаразова быу пераадолены сяміметровы рубеж. Перад ад'ездам на Спартакіяду Народау СССР у Маскву на адным з адборачных спаборніцтвау Леанід трауміравау нагу. Аб паездцы не прыходзілася і марыць. З вялікай цікавасцю сачыу юнак за выступленнямі на Спартакіядзе беларускіх спартсменау. Шчыра перажываў іх поспехі і няудачы.

22-га жніуня ў Днепрапетроуску пачалася Усесаюзная студэнцкая спартакіяда. У ёй прынялі удзел спартсмены 22-х буйнейшых ВНУ краіны. У ліку беларускіх легкаатлетау быу і Леанід Станішэускі. Прадстаяла барацьба з мацнейшымі прыгунамі. Паказаушы вынік 6 м 73 см, Леанід вайшоу у фінал. Яго вынік быу адным з лепшых. У фінале, аднак, удзельнічаць яму не прышлося—у гэты час юнак выступау у траiным прыжку. Агульнае чацвертае месца—такі вынік Станішэускага.

Зараз калектыу універсітэта папоуніуся новай групай спартсменай-першакурснікаў. Сярод іх знаходзіцца стары спартыуны праціунік Леаніда—Уладзімір Гараеу—студэнт таго-ж хімічнага факультэта. І ужо цяпер, сустракаючыся з Уладзімірам у прасторных універсітэцкіх калідорах, Леанід думае аб той барацьбе, якая чакае яго у будучых спаборніцтвах. Перамога дастанецца мацнейшаму.

Што-ж, трэба трэніравацца, упорна, настойліва!

А. УХАНАЎ,
студэнт 4 курса аддзялення журналістыкі.

Насустрач фестывалю

НЯХАЙ МАЦНЕЙ ГУЧАЦЬ НАШЫ ПЕСНІ!

Ларысе Кошкінай спадабаюцца народныя украінскія, рускія і беларускія песні. І калі-б не моцнае заханленен літаратурай, роднай мовай, мабыць, мы ўбачылі-б яе зараз у сценах кансерваторыі.

З першых дзён заняткаў ва універсітэце яна прыйшла да Ільі Яфімавіча Кліёнскага:

— Вы запішаце мяне ў харавы гурток?

— Запішу...

Прайшло больш трох год, а Ларыса з мінулым хваляваннем працягвае наведваць харавы гурток. Вось і зараз яна сядзіць і уважліва сочыць за кожным рухам дырыжора. Калектыў развучвае нбвую песню эстонскага кампазітара Эрнесакса «Мая краіна».

А вось Георгій Клебанаў. Ён таксама даўно захапляецца песняй. Ужо два гады спявае Георгій ва універсітэцкім хоры. Зараз ен выконвае сольныя партыі.

Кіраўнік і дырыжор хора Ілья Яфімавіч Кліёнскі з вялікай любоўю выхоўвае моладзь. Да прадстаячых выступленняў хор рыхтуе вялікую праграму. Харысты развучваюць песні краін народнай дэмакратыі, творы беларускіх кампазітараў.

Нядаўна створан ва універсітэце, але ўжо завяваў вялікую папулярнасць у студэнтаў наш танцавальны калектыў. Выступаючы сумесна з аркестрам народных інструментаў, ен паказаў гледачам чэшскую і беларускую польскі, «Лявоніху», «Рускі танец».

Мы знайшлі танцавальны калектыў у 30 аудыторыі біякорпуса. Тут амаль заусёды адбываюцца рэпетыцыі танцораў. Бадзёрыя гукі «Гапака» змяняюцца «Рускім танцам». Адсутнічаючага кіраўніка стараюцца як мага лепш замяніць аднакурснікі юрыдычнага факультэта Аляксандр Крамнік (злева) і Аляксандр Бірукоў (справа).

Вось Аляксандр Крамнік заўважыў, што ў некаторых танцорау не атрымоўваецца рух, які яны называюць «паўзункам». Ён сабраў хлопцаў і ў каторы ужо раз паказвае ім: вось як патрэбна яго выконваць.

Пабываўшы на рэпетыцыях, паглядзеўшы, як удасканальваюць сваё майстэрства спевакі і танцоры, так і хочацца пажадаць ім: працуйце, таварышы, настойліва, старанна! Няхай мацней гучаць нашы песні, няхай прыгажэйшымі будуць нашы танцы!

У. АЛЯКСАШЫН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Бабруйская вул., корпус «А», пакой 13, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 07555 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1070. Тыраж 2000